ЛЮБАНШЧЫНА ПАРТЫЗАНСКАЯ

# Напярэдадні вызвалення: чэрвень

**23.06.1944 пачалася Беларуская наступальная аперацыя пад кодавай назвай «Баграціён». Да яе рыхтаваліся не толькі камандаванне Чырвонай Арміі, а і партызанскія фарміраванні, у тым ліку атрады, якія дзейнічалі на тэрыторыі Любаншчыны.**

Першымі выступілі III і II Беларускія і I Прыбалтыйскі франты, а 24 чэрвеня падключыўся I Беларускі фронт. Партызанскія радысты кожны дзень прымалі весткі аб поспехах Чырвонай Арміі: 26 чэрвеня вызвалены Віцебск і Жлобін; 27 чэрвеня акружана і разгромлена віцебская групоўка праціўніка, вызвалена Орша; 28 чэрвеня вызвалены Магілёў; 29 чэрвеня вызвалены Бабруйск, акружана і разгромлена бабруйская групоўка праціўніка. Лінія фронту набліжалася да Любаншчыны.

У тыле ворага таксама не спынялася барацьба. Штаб Мінскага партызанскага злучэння распрацаваў план баявых аперацый брыгад, які прадугледжваў не толькі нанясенне ўдараў па нямецка-фашысцкіх войсках, але і меры па збераджэнні ад знішчэння адступаючымі варожымі часцямі населеных пунктаў і мірнага насельніцтва ад угону ў Германію.

Пасля вызвалення Старых Дарог і Глуска лінія фронту ўшчыльную наблізілася да межаў Любанскага раёна. 28 чэрвеня ў 14.00 камандзір 19 механізаванай брыгады **Уладзімір Яршоў** атрымаў загад наступаць у напрамку вёскі Вялікія Чабусы з задачай да выхаду дня авалодаць г.п. Любань. Праз дзве гадзіны падраздзяленні брыгады пачалі наступленне. У 18.30 перадавыя сілы на рубяжы Касцяшы-Зялёнкі-Асавец-Трубяціна выйшлі да лініі абароны праціўніка, якую ўтрымліваў 570 пяхотны полк 292 пяхотнай дывізіі, узмоцнены трыма самаходнымі ўстаноўкамі «Фердынанд» і двума танкамі «Пантэра». Бой доўжыўся каля гадзіны. У дзённіку баявых дзеянняў 9 танкавага палка зроблены запіс: «У 19.30 перадавы атрад 19 мехбрыгады ўварваўся на паўночна-ўсходнюю ўскраіну в. В. Чабусы, праціўнік схаваўся ў бункерах і агнём самаходнай артылерыі і танкаў затрымаў наша наступленне». У баі за В. Чабусы загінулі 13 байцоў Чырвонай Арміі. Сярод іх радыст танка Аляксандр Брауч, радавы Іван Варламаў, артылерысты Іван Лысак і Мікалай Мардасаў.

На досвітку 29 чэрвеня, выбіўшы праціўніка з В. Чабус, часці 19 мехбрыгады выйшлі на ўсходні бераг Арэсы ля г.п. Любань. Заходні – высокі бераг ракі – за час акупацыі быў моцна ўмацаваны. Уздоўж берагавой лініі былі пабудаваны траншэі і ДЗОТы, у дамах на беразе знаходзіліся агнявыя кропкі. Абарону ўтрымлівалі падраздзяленні 129, 35 і 292 пяхотных дывізій агульнай колькасцю да палка і 255 сапёрны батальён, узмоцненыя двума артдывізіёнамі і чатырма мінамётнымі батарэямі, танкамі і самаходнымі ўстаноўкамі. Былі ўмацаваны і іншыя населеныя пункты раёна – каля в. Калінаўка стаяла артылерыйская батарэя, а ўздоўж лініі фронту па чыгунцы пастаянна курсіраваў бронецягнік. Мост праз Арэсу быў узарваны, а наладзіць пераправу было досыць складана: подступы да ўсходняга берага Арэсы былі забалочаныя і знаходзіліся пад прыцэльным агнём ворага.

Раніцай 29 чэрвеня падраздзяленні 19 мехбрыгады пачалі наступленне на Любань: на вышынях каля Вежанкі артылерыйскі і мінамётны дывізіёны адкрылі агонь па праціўніку. У гэты час 3 мотастралковы батальён пачаў абыходны манеўр у напрамку Касье і Арлёва з задачай фарсіраваць Арэсу і выйсці на паўднёва-заходнюю ўскраіну Любані. Аднак на падыходзе да в. Сарачы батальён быў скаваны варожым кулямётным і мінамётным агнём. У гэты час на ўчастак 19 мехбрыгады падышлі палкі 48 стралковай дывізіі. На правым фланзе праз рубеж Плюсна-Трубяціна-Вялікія Чабусы-Вежанка рухаўся 146 стралковы полк, на левым фланзе праз рубеж Прусы-Трайчаны-Пярэспа-Пласток-Пеклічы – 138 і 143 стралковыя палкі. За імі ішла артылерыя (98 артполк). На працягу дня 146 стралковы полк, фарсіраваўшы Арэсу, заняў міжрэчча Арэсы і Таліцы, батальёны 138 і 143 стралковых палкоў пераправіліся праз Арэсу каля Арлёва.



**Уладзімір Васільевіч ЯРШОЎ, камандзір 19 механізаванай брыгады.**



**Міхаіл Трафімавіч ЧАЦВЕРЫКОЎ, камандзір 2 танкавага батальёна 219 танкавай брыгады.**



**Аляксей Аляксандравіч КРЫВАШЧОКАЎ, камандзір узвода інжынерна-міннай роты 19 мехбрыгады.**



**Мікалай Яфрэмавіч ВАЛОШЫН, старшы ад'ютант 2 батальёна 166 стралковага палка 55 стралковай дывізіі.**

Адначасова з рэгулярнымі часцямі Чырвонай Арміі на тэрыторыі раёна вялі баявыя дзеянні партызанскія атрады: народныя мсціўцы мініравалі шашэйныя дарогі, рабілі на лясных участках завалы, вялі баі з засад з адступаючымі варожымі часцямі, наносіліся ўдары па чыгунцы, якая была запруджана войскамі праціўніка. Аляксандр Далідовіч, камандзір партызанскай брыгады №25 імя П. Панамарэнкі, у сваім дзённіку піша: «28 чэрвеня, серада. Партызаны атрада Плышэўскага каля в. Ярэмічы з засады забілі двух нямецкіх салдат і столькі ж паранілі. Падрыўнікі атрада Качанава на дарозе В. Гарадзяцічы-Камаровічы ўзарвалі нямецкі грузавік з салдатамі. Забіта і паранена да 15 немцаў, машына разбіта. Падрыўнікі атрада Бародзькі на дарозе Любань-Пагост залажылі міны, на якіх узарваліся дзве аўтамашыны. 29 чэрвеня, чацвер. Каля вёскі Восьмая брыгада партызаны атрада з засады разбілі нямецкую легкавую аўтамашыну. Машына згарэла, у перастрэлцы забіты два нямецкія салдаты, у палон узяты обер-лейтэнант, які быў дастаўлены ў штаб злучэння».

29 чэрвеня ў 17.00 пачаўся бой за Любань. Праз дзве гадзіны пасля 10-хвіліннай артпадрыхтоўкі мотастралковыя батальёны 19 мехбрыгады, падтрыманыя стралковымі палкамі 48 стралковай дывізіі, атакавалі і выйшлі на ўскраіны гарадскога пасёлка. Праціўнік не змог утрымацца на выгадным для яго рубяжы па рацэ Арэсе і пачаў паспешны адыход на захад, аказваючы жорсткае супраціўленне. На зыходзе 29 чэрвеня ў 24.00 ва ўзаемадзеянні з 55 і 20 стралковымі дывізіямі 20 стралковага корпуса і з 2 і 3 мотастралковымі батальёнамі 19 мехбрыгады стралковыя палкі 48 стралковай дывізіі з флангаў ахапілі Любань і да 3.00 30 чэрвеня цалкам знішчылі варожую групоўку. Сапёры прыступілі да навядзення пантоннага моста і часовага драўлянага насціла для пераправы асноўных сіл Чырвонай Арміі.

Бой на подступах да г.п. Урэчча таксама ішоў 29 чэрвеня. 219 танкавая брыгада, перад якой паставілі задачу авалодаць Слуцкам, перад рэкамі Арэса і Салон вымушана была спыніцца: масты ўзарваны, танкі ўброд не пройдуць, каля в. Горкі трымаю абарону варожыя гарнізоны. Камандаванне брыгады прыняло рашэнне: наступаць на Слуцк двума флангамі. Частка брыгады засталася штурмаваць лінію абароны каля Горак, другая накіравалася на Урэчча. У раёне Рэпішча навялі чарговую пераправу. Наколькі складана і небяспечна было выкананне гэтай задачы, можна даведацца з журнала баявых дзеянняў 219 танкавай брыгады: «Сапёрны ўзвод, наводзячы пераправу праз Арэсу, ноччу пад агнём праціўніка паказаў узоры адвагі і мужнасці. Людзі працавалі 15 гадзін без адпачынку і з падручнага матэрыялу зрабілі пераправу праз раку і прылеглыя балоты, якія забяспечылі пропуск сярэдніх танкаў...». Скарыстаўшыся затрымкай на пераправе, праціўнік за ноч падцягнуў рэзервы: Урэчча абаранялі да батальёна пяхоты, 10 танкаў і 4 самаходныя ўстаноўкі. Нават замаскіраваны бронецягнік прыбыў на чыгуначную станцыю. Без перапынку фашысцкая авіяцыя наносіла масіраваныя штурмавыя ўдары. Адбіваючы іх атакі, у небе над Урэччам у паветраным баі загінулі стралкі Іван Родзін і Сяргей Сальнікаў.

На досвітку 29 чэрвеня тры танкавыя батальёны і рота механізаванага батальёна аўтаматчыкаў 219 танкавай брыгады выйшлі на паўднёвыя ўскраіны Урэчча і ўступілі ў бой. У выніку праціўнік быў разбіты і адступіў у напрамку Слуцка. Да 14.00 Урэчча было ачышчана ад акупантаў.

У баі за Урэчча вызначыўся асабовы склад 2 танкавага батальёна і механізаванага батальёна аўтаматчыкаў. У данясенні аб баявых дзеяннях брыгады за 29 чэрвеня адзначаецца, што камандзір батальёна, капітан **Міхаіл Чацверыкоў**, павёў батальён у атаку і загінуў ва ўпартым баі. Не стала і камандзіра роты супрацьтанкавай зброі механізаванага батальёна аўтаматчыкаў ст. лейтэнанта Лукі Будза. Усяго пры вызваленні Урэчча загінулі 14 і былі паранены 18 чалавек асабовага складу 219 танкавай брыгады.

**30 чэрвеня ўся тэрыторыя Любанскага раёна была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

Сцяпан Ісайка, партызан атрада імя Громава брыгады №64 імя В. Чкалава, успамінае: «30 чэрвеня 1944 года мы сустрэліся з часцямі Чырвонай Арміі каля вёскі Пеклічы. Спачатку пачулі гул, затым убачылі пыл – гэта ішлі нашы танкі. Сустрэча была радаснай, нас нават накармілі з салдацкай франтавой кухні. Затым я і некалькі партызан, паколькі мы ведалі раён, селі на танкі і разам з чырвонаармейцамі ўступілі ў Любань».

У баях за Любанскі раён вызначыліся многія салдаты і афіцэры Чырвонай Арміі. Баявымі ордэнамі і медалямі пры вызваленні раёна былі ўзнагароджаны радавыя Агальцоў, Аляксандр Падлесных, Валі Мінгалімаў. Старшына **Аляксей Крывашчокаў** пры фарсіраванні ракі Арэсы своечасова аднавіў пераправу, забяспечыўшы рух нашых войскаў наперад, за што быў прадстаўлены да ўзнагароджання ордэнам Чырвонага Сцяга. Былі ўзнагароджаны лейтэнанты Ілья Брук і Серафім Бабкоў. Па-геройску праявілі сябе капітаны Аўчыннікаў і Мікалай Нізінскі, танкавыя экіпажы лейтэнантаў Туканава і Жукава, атрымалі падзяку пры вызваленні Любанскага раёна падпалкоўнік Мікалай Амельчанка, лейтэнант Касенка. Камандзір 19 мехбрыгады Уладзімір Яршоў за ўмелае камандаванне пры вызваленні Любані быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Яго імем у г. Любані названа вуліца.

Сёння мы перагортваем апошнюю старонку дзённіка Міхаіла Жалтова, партызана атрада імя Я. Гарбачова брыгады №25 імя П. Панамарэнкі, дзе чытаем: «22-28 чэрвеня. Пачалося наступленне. Доўгачаканы дзень настаў. Усе рыхтуюцца да сустрэчы Чырвонай Арміі. Заняты Старыя Дарогі і Глуск, ідуць баі за Бабруйск. Падыходзяць да Любані, да нашага раёна. 2 ліпеня. Прыйшлі ў Любань і прыступілі да ўтварэння Савецкай улады».

**Наталія СІНЯК, дырэктар Любанскага музея народнай славы.**